# Весці

**БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА**

## № 1 (11) 1997

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

*Галоўны рэдактар:*
Л. М. Ціханаў

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
Г. А. Баўтута
В. А. Бондар
(*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
А. А. Грымаць
Т. А. Грыгор'ева
І. І. Казімірская
Я. Л. Каламінскі
Л. А. Кандыбовіч
Г. А. Космач
Т. Е. Лемешава
(*адказны сакратар*)
М. І. Мішчанчук
І. А. Новік
М. М. Плескацэвіч
(*нам. галоўнага рэдактара*)
А. У. Рагуля
М. Т. Стэльмашук
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
Л. Б. Шнэперман
У. А. Якавенка
М. С. Яўневіч

## ЗМЕСТ

### Педагогіка

*Ціханаў Л.Н., Гаўрылавец К.У., Бондар В.А., Быкадораў Ю.А.* Рэалізацыя прынцыпу гуманізацыі адукацыі праз спецыяльны прадмет ..........3

*Камінская С.А.* Фарміраванне прафесійных каштоўнасных арыентацый студэнтаў у працэсе педагагічнай практыкі..........9

*Іваноў Ю.А.* Матывацыя творчасці ў працэсе навучання..........13

*Міхальчук М.П.* Сучаснае разуменне патрыятызму студэнтамі педагагічных ВНУ ......17

*Зяленін В.М.* Аб дыдактычнай мадэлі курса «Навучанне ігры на скрыпцы» ..........21

*Кунцэвіч В.М.* Народна-інструментальная музыка як сродак выхавання духоўнай культуры моладзі ..........26

*Кузнецов В.В., Кузнецова О.В.* Биологические закономерности процесса обучения и адаптации к внешним воздействиям ..........30

*Васілеўскі А.Б.* Даследчы аналіз задач ..........37

### Псіхалогія

*Васкабовіч Н.П.* Развіццё ў працэсе чытання ..........45

### Мовазнаўства

*Груцо А.П.* Функционирование некоторых малоизвестных полонизмов в белорусском языке ..........51

220?09 г. Мінск
вул. Савецкая, 18
БДПУ, Бібліятэка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 281

*А. М. Сурта*

# МАНАСТВА І КЛЯШТАРЫ Ў ФРАНКСКАЙ ДЗЯРЖАВЕ (VI — сярэдзіна VIII ст.)

Манаства і кляштары як важнейшы хрысціянскі інстытут, які зарадзіўся на Ўсходзе, знайшоў у V ст. цвёрдую глебу на Захадзе і перш за ўсё ў Галіі. У VI ст., як і ў эпоху імперыі, асаблівасцю манаства на Захадзе, у тым ліку і ў франкскай дзяржаве, была адсутнасць яго дакладнай арганізацыі і структуры. (Менавіта таму не згубіў свайго значэння выраз: «Колькі кляштараў, столькі і правілаў» [1].)

У канцы V – пачатку VI ст. манахі Галіі, як і раней, грунтаваліся вакол гор Юра, дзе знаходзіліся іх шматлікія паселішчы на чале з Лерынскім кляштарам, які з'яўляўся не толькі цэнтрам царкоўнай тэалогіі, ідэалогіі строгага аскетычнага жыцця, але і ўзорам для іншых кляштараў. У VI – VII ст. колькасць кляштараў павялічвалася, узростаў іх аўтарытэт сярод насельніцтва. Гэта было звязана з тым, што ўзросшая сацыяльная напружанасць у Меравінгскай дзяржаве не спрыяла павышэнню ўзроўню жыцця, а кляштарныя ўмовы гарантавалі адносна выгаднае існаванне. У VI ст. Хлодвігам быў заснаваны кляштар св. Жэнеўевы ў Парыжы, Радэгундай – кляштар св. Крокса ў Пуац'е, Брунгільдай – св. Марціна ў Ацёне, Сігізмундам – Сант-Морыц у Аргоне і многія іншыя [2]. З'явіліся жаночыя кляштары, першы з іх быў заснаваны на тэрыторыі Галіі ў Арлі ў пачатку VI ст. епіскапам Цэзарыем і яго сястрой [3]. Актыўнае развіццё манаства ў перыяд першых Меравінгаў спрыяла росту кляштараў, якіх у канцы гэтага стагоддзя ў дзяржаве налічвалася каля 215[1]. [4] Кляштары паступова ўзнікалі на ўсёй тэрыторыі і размяшчаліся як у епіскапскіх уладаннях, так і паза іх межамі.

[1] Фрагментарнасць захаваных звестак не дазваляе ўстанавіць дакладную колькасць кляштараў у франкскай дзяржаве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паралельна з кінавіційным манаствам у франкскай дзяржаве ў VI ст. існавалі вандроўныя аскеты, а таксама групы анахарэтаў-ерэмітаў і рэклузаў, якія жылі ў адасобленых келлях [5]. Але ідэалы пазакляштарнай аскезы супярэчылі царкоўным устанаўленням: манахі-індывідуалісты ўяўлялі небяспеку для епіскапскай царквы, пагражалі яе дысцыпліне і самой царкоўнай арганізацыі. Таму епіскапы імкнуліся выкараняць пустэльніцкія традыцыі анахарэтаў і рэклузаў, а жадаючыя стаць пустэльнікамі павінны былі атрымаць на гэта згоду адпаведнага епіскапа або абата [6]. Аднак названая катэгорыя манахаў практычна знікла ў VII-VIII ст. і ўступіла месца кляштарам.

На працягу VII-VIII ст. у франкскай дзяржаве рабіліся захады да арганізацыйнага афармлення кінавіційнага манаства. Узначаліў гэты накірунак дзейнасці епіскап Цэзарый Арльскі, выхадзец з Лерынскага кляштара. Грунтуючыся на лерынскіх манаскіх традыцыях, ён склаў сціслыя правілы для манахаў, якія засноўваліся на прынцыпах абшчыннага жыцця, абмежавання свабоды і індывідуалізму [7]. Але гэтыя спробы кляштарнай уніфікацыі насілі лакальны характар і мелі дачыненне пераважна да раёна Арля. Акрамя правілаў Цэзарыя, у франкскай дзяржаве з'явіліся правілы Аўрэліяна, Ферэола, Даната [8]. Аднак поспех і найбольш шырокае распаўсюджанне з канца VI ст. у Меравінгскай дзяржаве атрымалі правілы Бенедыкта Нурсійскага і ірландскага манаха Калумбана. Дакладна не ўстаноўлена паяўленне гала-франкскіх манахаў, якія кіраваліся бенедыкцінскімі правіламі. Паводле легенды, бенедыкцінскія правілы манаскага жыцця ў франкскай дзяржаве ўвёў св. Маўр, які прыбыў у 513 г. у Арлеан. А першым вядомым бенедыкцінскім кляштарам у дзяржаве Меравінгаў быў Гланфельскі, які знаходзіўся ў Анжу. Да канца VI ст. многія франкскія кляштары прынялі бенедыкцінскія правілы. Паколькі на Захадзе ў гэтым стагоддзі існавалі разнастайныя кляштарныя статуты, то заслуга Бенедыкта заключалася ў іх уніфікацыі, звядзенні да аднолькавасці. Гэтыя правілы залажылі кляштарную традыцыю з асноўнымі прынцыпамі манаскага жыцця, прадугледжвалі кляштарную стабільнасць, падпарадкаванне і паслушэнства абату, рэгламентацыю дзённага распарадку, памяркоўны аскетызм, абавязковую фізічную працу і гасціннасць у адносінах да пілігрымаў, убогіх і абяздоленых [9].

Распаўсюджанне бенедыкцінската статута з'явілася фактыч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на пачаткам разбурэння мясцовага гала-франкскага манаства і яго традыцый. Гэты працэс паглыбіўся, калі з канца VI ст. кляштарнае жыццё ў дзяржаве Меравінгаў стала абцяжарвацца з-за націску іра-шатландскага манаства, якое дзейнічала ў розных раёнах краіны і закладвала новыя кляштары. Прычым дзейнасць гэтых кляштараў падтрымлівалася Меравінгскімі каралямі, некаторыя з якіх былі асабіста знаёмы з іра-шатландскімі місіянерамі, як, напрыклад, кароль Гунтрамн, які запрасіў вядомага іра-шатландскага манаха Калумбана ў Бургундыю. Там Калумбан заснаваў Люксельскі кляштар, што стаў найбольш знакамітым з усіх ірландскіх кляштараў на кантыненце, а затым кляштары Анэгрэй, Фонтанэ, Сен-Гален [10], ператвораныя ў далейшым у цэнтры духоўнага, рэлігійнага і культурната жыцця. У ірландскіх кляштарах развіццё атрымала практыка стварэння комплексу ў спалучэнні бібліятэкі, скрыпторыя і школы, якія служылі справе захавання ўзроўню антычнай адукаванасці і фарміраванню новых культурных цэнтраў у Заходняй Еўропе з іх асаблівым тыпам асветніцкай дзейнасці. Шырокая сетка іра-шатландскіх кляштараў распаўсюдзілася па ўсёй франкскай дзяржаве. На поўначы краіны гэтых кляштараў налічвалася каля 40, некаторыя з іх існавалі ў Безансоне, пры Юры, Марне. Паплечнікі Калумбана засноўвалі кляштары ў Парыжы, Камін'яне, Шаратоне [11]. Усе іра-шатландскія кляштары кіраваліся правіламі Калумбана, якія базіраваліся на іра-шатландскіх манаскіх традыцыях крайняга аскетызму і суровай сістэмы пакаранняў за найменшае парушэнне дысцыпліны. Сістэма забарон і жорсткая рэлігійнасць, якая грунтавалася на прымушэнні і пакаранні, зморвала манахаў і выклікала іх незадаволенасць. Таму калумбанаўскія правілы, якія патрабавалі ўласцівай усходняму манаству паслухмянасці, непрымальнай для германскага захаду, не вытрымлівалі канкурэнцыі ў франкскай дзяржаве з больш мяккімі бенедыкцінскімі палажэннямі. Пасля смерці Калумбана ў 615 г. яго манаскі статут быў апрацаваны ў менш жорсткім характары, затым ён паступова выціскаўся бенедыкцінскім. Акрамя таго, адсутнасць строгай арганізацыі франкскага манаства, адносная свабода ўнутрыкляштарнага жыцця садзейнічалі пранікненню ў калумбанаўскія кляштары бенедыкцінскіх звычаяў. Так, напрыклад, у 629 г. у Люксельскім кляштары правіламі Бенедыкта карысталіся нараўне з правіламі Калумбана [12]. А епіскап Леадэгарый Ацёнскі ў 680 г. вызначыў бенедыкцінскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

статут у якасці адзінага ў яго царкоўнай акрузе [13]. К канцу VII ст. правілы Бенедыкта панавалі амаль паўсюдна ў кляштарах франкскай дзяржавы, таму што былі менш суровымі ў параўнанні з калумбанаўскімі, больш практычнымі і прыстасаванымі да патрэб франкскай царквы. Аднак агульнай для абодвух кляштарных статутаў была тэндэнцыя да ўхілення ад улады епіскапа. Праўда, бенедыкцінскія кляштары, хаця і прызнавалі (у адрозненне ад іра-шатландскіх) першынство епіскапа дыяцэза над кляштарам, але патрабавалі аўтаноміі і недатыкальнасці ўнутрыкляштарнага жыцця і маёмасці [14].

Ужо ў канцы V ст. у сувязі з ростам уплыву манаства епіскапы стараліся падпарадкаваць яго сваёй юрысдыкцыі. У VI ст. гэта тэндэнцыя значна ўзмацнілася: саборныя пастановы замацоўвалі духоўную і матэрыяльную ўладу епіскапаў над жаночымі і мужчынскімі кляштарамі ў дзяржаве Меравінгаў; епіскапы наносілі візіты ў кляштары і збіралі канферэнцыі абатаў, мітрапалітальныя і агульнадзяржаўныя саборы прымалі рашэнні па кляштарных справах. Наогул, кляштары разглядаліся як царкоўны інстытут, які з'яўляецца ўласнасцю царквы [15]. Юрысдыкцыя епіскапаў ахоплівала шырокую сферу жыццядзейнасці кляштараў і манахаў: заснаванне кляштараў, унутраную дысцыпліну, выбары і дзейнасць абатаў, кляштарную маёмасць і даходы. Падобнае ўсеўладдзе епіскапаў над кляштарамі выклікала пратэст апошніх, які выяўляўся як у скаргах мітрапалітам і саборам, так і ў адмове падпарадкавацца епіскапскім прадпісанням і прымаць епіскапа ў кляштары. Так, у 602 г. Калумбан пасварыўся з бургундскімі епіскапамі, таму што не жадаў падпарадкавацца епіскапскай уладзе і мясцовым звычаям [16]. Па прыкладу Люкселя іншыя кляштары ў дзяржаве Меравінгаў імкнуліся дабіцца незалежнасці ад мясцовага епіскапа. Гаворка ішла перш за ўсё аб аўтаноміі кляштарнай зямлі, праве самастойнага выбару абата са свайго асяроддзя, падпарадкаванні манахаў дысцыплінарнай уладзе абата, забароне ўваходжання епіскапа ў кляштар.

Аднак пералічанымі перавагамі валодалі не ўсе кляштары. Толькі некаторыя з іх атрымлівалі ад епіскапа вызначаныя прывілеі і імунітэты, так званыя хартыі [17], многія з якіх, аднак, мелі фармальны характар і на практыцы пастаянна парушаліся. Таму кляштары ў сваім імкненні абараніцца ад уціску епіскапата шукалі сабе заступнікаў у асобе каралёў або рымскіх пап, тым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

больш, што каралі самі нярэдка з'яўляліся заснавальнікамі кляштараў і ўмешваліся ў адносіны паміж епіскапамі і кляштарамі, апякалі апошніх, забаранялі епіскапам квапіцца на кляштарную маёмасць і права манахаў. Часам свецкай уладай кляштарам дараваліся розныя прывілеі ў падаткаабкладанні [18], асабліва ў эпоху Піпіна Кароткага (741-768), які браў кляштары над сваё заступніцтва і абарону.

Такім чынам, уніфікацыя франкскага манаства на падставе бенедыкцінскага статута значна ўзмацніла ролю кляштараў у царкоўным і грамадскім жыцці. На працягу VI — першай паловы VIII ст. кляштары сталі адным з найбольш важных і буйных царкоўных інстытутаў, якія валодаў шырокімі землямі і карыстаўся правамі землеўладання, якія існавалі ў феадальную эпоху. Кляштары складалі асобную частку царкоўнай арганізацыі. Некаторыя з іх дабіваліся аўтаноміі адносна дыяцэзальных епіскапаў. Аднак франкскія кляштары затым апынуліся ў непасрэдным падпарадкаванні ў пап або франкскіх каралёў.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. Hilpisch St. Geschichte des benediktinischen Mönchtums. Freiburg, 1923. S. 50; Loening E. Geschichte des deutschen Kirchenrechts. Strassburg, 1878. Bd. II. S. 369.
2. Fournier G. L'occident fin du V[e] fin du IX siecle. Paris, 1970. P. 54.
3. Gregor. Turon. Hist. Franc. V, 39; VI, 16, 29; VII, 36; VIII, 40; IX, 39, 40, 42 // PL. Parisiis, 1858. T. 71. Col. 161-573.
4. Cousin P. Precis d'histoire monastique. Paris, 1956. S. 115-135; Prinz F. Frühes Mönchtum in Gallien, der Rheinlanden und Bayern am Beispiel der monastishen Entwicklung (6.bis 8. Jahrhundert.) München-Wien, 1965. S. 105-106.
5. Concil. Aurelian. (511), can. XXII//PL. Parisiis, 1862. T. 84. Col. 237-301; Gregor. Turon. Hist. Franc., VIII, 34; Graus F. Volk, Herrscher und Heiligen im Reich der Merowinger. Praha, 1965. S. 109.
6. Concil. Aurelian. (511), can. XXII.
7. Caesarii episc. Arelaten Regula ad Monachos, I-XXVI//PL. Parisiis, 1848. T. 67. Col. 1098-1104.
8. Hilpich St. Op. cit. S. 104, 106.
9. Regula S. Benedicti, XXXIII, XLVIII, LXVIII//PL. Parisiis, 1859. T. 66. Col. 215-933.
10. Jona abbas Elnonensis. Vita S. Columbani, VI, XI, XII, XVI//PL. Parisiis, 1863. T. 87. Col. 1011-1045.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

11. *Катанский А*. Очерк истории древних национальных литургий Запада // Христианское чтение. 1870. Ч. 1. № 1-6. С. 86.
12. Traube L. Textgeschichte der Regula S. Benedicti. München, 1898. S. 633.
13. Concil. sub Theoderico rege in quadam villa regia Celebratur (680) // MGH. Concil. Hannoverae, 1893. T. I. P. 1-225.
14. Regula Benedicti, III, LXII, LXIII, LXIV, LXVII // PL. Parisiis, 1859. T. 66. Col. 215-933; Regula monachorum, XXIV, XXVI // PL. Parisiis, 1860. T. 80. Col. 307-894.
15. Concil. Aurelian. (511), can. XV, XIX; Concil. Epaunen. (517), can. V, XXVIII; Concil. Arelaten. (554), can. I, II, V.
16. Jona abbas Elnonensis. Vita S. Columbani, XXX, XXXI.
17. Marculfus Formulae monachorum, I, 1 // MGH. Legum V. Hannoverae, 1882. T. I. P. I. P. 32-106.
18. Gregor. Turon. Hist. Franc. III, 7; IX, 33, 40, 42; X, 7, 12; Gregor I papa. Epist. VII, 12 // PL. Parisiis, 1849. T. 77. Col. 431-1327.

## SUMMARY

***The article considers the peculiarities of the kinovite monastic formation, its organization and structure in the Frank state, as well as the role of monastery in Germanic states, including their relations with local episcopate, kings and the Popes.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ